# ЭЛЕКТРОННЫЯ СТАСУНКІ І СУПЕРСЭРВІСЫ

## лічбавага форуму #GBCregions (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне)

**Прэзентацыя найноўшых дасягненняў і праектаў Беларусі ў сферы лічбавай трансфармацыі на шляху стварэння электроннага ўрада адбудзецца 18—19 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы падчас II Міжнароднага лічбавага форуму #GBCregions (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне). Эксперты, у прыватнасці, раскажуць пра ўкараненне ID-картак, стварэнне праактыўных паслуг і суперсэрвісаў, а таксама паведамяць аб інфармацыйнай бяспецы, цэнаўтварэнні і перавагах воблачных рашэнняў над лакальнымі.**

### 25 мільёнаў лічбавых паслуг за чатыры месяцы

Эксперты, як і летась, разглядаюць форум як дыялогавую пляцоўку для ўмацавання супрацоўніцтва і пошуку новых рашэнняў ва ўзаемадзеянні дзяржавы, бізнесу і грамадзян. Аднак сёлета яго межы павялічацца да сямі тэматычных секцый замест адной, якія, да таго ж, можна будзе «наведаць» падчас анлайн-трансляцыі на сайце форуму, абяцаюць арганізатары. Цікавай разынкай стане і ўзнагароджанне найлепшага «Рэгіёна лічбавых магчымасцяў», назву якога пакуль трымаюць у сакрэце.

— Тэматыкай секцый стане галіновая лічбавізацыя, рашэнні для разумнага горада і разумнага дома, інфармацыйнай бяспекі і шэраг цікавых рашэнняў у банкаўскай сферы, — падкрэсліў **Аляксей ЦЫМБАЛАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра абмену трафікам.**

У галіне развіцця электронных паслуг і сэрвісаў Беларусь дасягнула такога ўзроўню, якім краіна ўжо можа падзяліцца, у тым ліку з замежнымі партнёрамі. Гэта стала відавочным па выніках яшчэ леташняга форуму, які стаў вельмі паспяховым і выклікаў вялікую цікавасць у беларускіх і замежных гасцей. Гэткая ж увага чакаецца і сёлета, а ганарыцца нам ёсць чым, заўважыў **Раман ГРАДУСАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг:**

— Паспяхова функцыянуе шэраг дзяржаўных інфармацыйных сістэм і рашэнняў, якія забяспечваюць камфортны электронны дыялог дзяржавы, бізнесу і грамадзян. Гэта, прынамсі, сістэма міжведамаснага электроннага дакументаабароту дзяржорганаў краіны, да якой падключана ўжо больш як 90 % арганізацый рэспубліканскага і мясцовага ўзроўняў (больш як 15 тысяч абанентаў). Дзяржаўная сістэма кіравання адкрытымі ключамі па праверцы электроннага лічбавага подпісу. А таксама агульнадзяржаўная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма, дзякуючы якой за чатыры месяцы на адзіным партале электронных паслуг грамадзянам і бізнесу было аказана больш за 25 млн паслуг (летась за ўвесь год іх было крыху больш за 17 млн).

### Акцэнт

Сістэму аказання паслуг, якая цяпер працуе па заяўляльным прынцыпе, у перспектыве хочуць вывесці на выяўленчы, калі яна сама будзе нагадваць чалавеку, што яму трэба зрабіць. Напрыклад пры змене месца жыхарства сістэма нагадае пра неабходнасць заключыць дагаворы з камунальнымі службамі, вылучыць месца ў дзіцячым садку і дапаможа з іншымі пытаннямі, падзяліўся «электроннымі» планамі дырэктар цэнтра.

Эксперты падкрэслілі, што развіццю адміністрацыйных працэдур для грамадзян надаецца пільнае значэнне. Сёлета ў краіне мяркуюць перавесці ў электронны выгляд 131 адміністрацыйную працэдуру, а да 2025-га — каля 700. Пры гэтым акцэнт будзе зроблены на працэдуры ў сферы аховы здароўя і адукацыі.

На форуме эксперты раскажуць пра інфраструктуру, якая дазваляе здзяйсняць лічбавізацыю розных сфер жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства, паабяцаў **Алег СЯДЗЕЛЬНІК, генеральны дырэктар Беларускіх воблачных тэхналогій:**

— На такіх мерапрыемствах раскрываецца праблематыка, на экспертным узроўні абмяркоўваюцца варыянты рашэння задач, якія стаяць перад арганізацыямі. За дзесяць гадоў мы ўвялі ў эксплуатацыю больш за пяць тысяч базавых станцый сеткі чацвёртага пакалення. А звыш дзвюх тысяч юрыдычных асоб ужо карыстаюцца тэхналогіямі воблачных вылічэнняў. На форуме спецыялісты засяродзяць увагу на пытаннях кібербяспекі для прадухілення падобных атак.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

**Беларусь займае 40-е месца сярод 193 дзяржаў па ўзроўні гатоўнасці да электроннага ўраду. У краіне выдадзена больш за 1,2 млн ключоў электроннага лічбавага подпісу, а беларусы актывізавалі больш за 180 тысяч асабістых кабінетаў на адзіным партале электронных паслуг. На гэтым рэсурсе рэалізавана ўжо 226 відаў паслуг, 71 з якіх — адміністрацыйныя працэдуры, якімі толькі сёлета скарысталіся ўжо больш як 25 мільёнаў разоў.**